# МАКСІМАЛЬНА ПРАЎДЗІВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Марат Жылінскі акрэсліў ключавыя кірункі, па якіх адбываюцца фальсіфікацыі. «Сёння асноўныя намаганні фальсіфікатараў засяроджаны на ўкараненні ў свядомасць сусветнай грамадскасці антыгістарычных ідэй падабенства знешняй палітыкі СССР і фашысцкай Германіі: нібыта гэтыя краіны ставілі за мэту захоп Еўропы, сусветнае панаванне, — падкрэсліў рэктар. — Фальсіфікатары скажаюць вобраз савецкіх воінаў і савецкіх узброеных сіл у асобе Чырвонай Арміі, паказваючы іх у выглядзе гвалтаўнікоў, марадзёраў, якія прынеслі ў Еўропу не вызваленне, а нібыта акупацыю і разбурэнне. Акрамя таго, апаненты значна перабольшваюць даныя аб стратах савецкіх войскаў у ходзе ваенных дзеянняў з мэтай абвінавачвання камандавання ўсіх узроўняў у бесчалавечнасці і бессэнсоўнасці ахвяр. У тым ліку яны дыскрэдытуюць дзейнасць праслаўленых палкаводцаў, тых, каго ў народзе называюць Маршаламі Перамогі, а таксама памяншаюць значэнне вызваленчай місіі СССР у Еўропе, прыніжаючы ролю Савецкага Саюза ў ратаванні чалавецтва ад заняволення нацысцкай Германіяй і яе саюзнікамі».

Як паведаміў эксперт, адзін з асноўных кірункаў фальсіфікацыі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адносна нашай краіны заключаецца ў адмаўленні ўсенароднага характару барацьбы з нацысцкімі захопнікамі на тэрыторыі Беларусі, быццам бы ўсенародная барацьба прыдумана савецкай прапагандай ужо пасля вайны, а беларуския партызаны — толькі закінутая з-за лініі фронту малакалькасная група НКУС.

## МАСАВА ІШЛІ Ў ПАРТЫЗАНЫ

**Старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Марына КРАСНОВА** акцэнтавала ўвагу на тым, як вывучаецца гісторыя Вялікай Айчыннай вайны ў школе. «Калі параўноўваць з краінамі былога Савецкага Саюза, такой увагі да ваеннай тэмы, як у Беларусі, няма больш нідзе, — перакананая навуковец. — Першае ўяўленне аб вайне школьнікі атрымліваюць ужо ў чацвёртым класе. У дзявятым пачынаецца сістэмнае вывучэнне гісторыі. У дзясятым класе вучні зноў вяртаюцца да тэмы вайны: адбываецца акцэнт не на падзеях, якія мелі месца быць, а на разуменні таго, што і чаму адбылося, што нам трэба зрабіць, каб такія падзеі больш не паўтарыліся ні на нашай тэрыторыі, ні ўвогуле ў свеце. У 2004 годзе па даручэнні Прэзідэнта Беларусі ў школьную праграму быў уведзены факультатыў «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны», выдадзены вучэбны дапаможнік, які добра ведаюць у суседніх краінах».



Жыхары Гродна сустракаюць вызваліцеляў. Ліпень 1944 года.

У цяперашні час Нацыянальнай акадэміяй навук ажыццяўляецца сур'ёзны праект беларускіх і расійскіх гісторыкаў з мэтай стварыць агульныя дапаможнікі па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны для настаўнікаў. У іх павінны быць прадстаўлены пазіцыі як беларускіх, так і расійскіх гісторыкаў. Гэта, на думку вучоных, патрэбна для таго, каб школьнікі не проста атрымлівалі чыёсьці меркаванне аб вайне, а самі на аснове фактаў, аналізуючы іх, рабілі свае высновы. Каб, ужо скончыўшы школу, яны маглі самастойна разабрацца ў тым, што адбываецца ў свеце.

На думку Марыны Красновай, Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне, галоўную ролю ў якой адыграў Савецкі Саюз, з'яўляецца ключавым элементам нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. «Ніякія перыпетыі нашай гісторыі — ні распад Савецкага Саюза, ні гарачыя 1990-я, ні нападкі, якія датычыліся ролі Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне ў пачатку 2000-х, — не памянялі адносіны беларусаў да гэтай падзеі. Нам важна захаваць гэта, як і памяць аб ёй», — лічыць эксперт.

Акрамя таго, кандыдат педагагічных навук закранула тэму здрадніцтва. «У любым народзе ёсць людзі, якія ідуць на гэта, — упэўнена яна. — Аднак у Беларусі здрадніцтва не было масавай з'явай. А вось тое, што людзі масава ішлі ў партызаны і падпольшчыкі, гэта варта прызнаць».

## ЖАХІ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

**Дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Аляксандр ГОРНЫ** расказаў аб гісторыі вызвалення Гродзеншчыны. Увесь жах вайны горад над Нёманам спазнаў ужо 1 верасня 1939 года, калі нямецкая авіяцыя бамбіла Польшчу, у складзе якой тады знаходзілася Гродзенская вобласць. У гады Вялікай Айчыннай вайны 23 чэрвеня 1941 года Гродна быў захоплены нямецка-фашысцкімі войскамі, да канца ліпеня была акупавана ўся тэрыторыя сучаснай Гродзеншчыны. Тэрыторыя цяперашніх Гродзенскага і Ваўкавыскага раёнаў (тады гэта была Беластоцкая вобласць) увайшла ў склад Трэцяга рэйха. У гады вайны гэта была тэрыторыя Германіі, Усходняй Прусіі. Малавядомы факт: на дадзенай тэрыторыі дзейнічалі органы гестапа. У горадзе для яўрэйскага насельніцтва былі створаны два гета, актыўна пераследавалася польская інтэлігенцыя.

— Калі казаць пра асаблівасць акупацыі на тэрыторыі Гродзенскай вобласці, гітлераўцы праводзілі палітыку сутыкнення лбамі прадстаўнікоў шматлікіх нацыянальнасцяў, якія тут пражывалі, — адзначае кандыдат гістарычных навук. — У першую чаргу яны выкарыстоўвалі ў сваіх мэтах беларуска-польскі канфлікт, які быў найбольш актуальны на тэрыторыі сучасных Лідскага і Шчучынскага раёнаў. Дзеянні польскага падполля, Арміі Краёвай, якая актыўна дзейнічала супраць беларусаў, — яшчэ адна рыса акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Гродзенскай вобласці.

Не так шырока, як ва ўсходніх рэгіёнах Беларусі, але быў прадстаўлены на Гродзеншчыне і савецкі партызанскі рух. З ворагам змагалася каля 17 тысяч партызанаў, 26 партызанскіх брыгад, падпольшчыкі.

— Тэрыторыя Гродна і ўсёй вобласці была вызвалена ў 1944 годзе ў ходзе другога этапу аперацыі «Баграціён», падчас Беластоцкай і Віленскай аперацый, — расказвае Аляксандр Горны. — 16 ліпеня была вызвалена правабярэжная частка горада. За левабярэжную ж змагаліся цэлы тыдзень. Тое, што горад вызваляўся працягла і трагічна, на жаль, ніяк не прадстаўлена ў мемарыяльнай прасторы сучаснага горада. Каля 40 працэнтаў горада было разбурана, не выстаялі вядомыя помнікі архітэктуры, якія пасля вайны не былі адноўлены. Пасля вайны горад страціў свой сярэднявечны арэал.

## НЕВЯДОМЫЯ ФАКТЫ

Як высветлілася, тэма Вялікай Айчыннай вайны сёння надзвычай папулярная сярод студэнтаў-гісторыкаў. «Адна з галоўных праблем тых, хто займаецца даследаваннем увогуле ваеннай гісторыі Беларусі XX стагоддзя, — гэта абмежаваны доступ да архіваў і дакументаў, — растлумачыў **дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Андрэй МАКСІМЧЫК.** — У асноўным даводзіцца працаваць з раней выдадзенымі зборнікамі дакументаў або з тым, што цяпер актыўна выкладваецца ў глабальную сетку, што дазваляе адкрываць у тым ліку новыя, раней невядомыя факты ўдзелу і подзвігу асобных вайскоўцаў і партызанаў на тэрыторыі Беларусі».

Гісторык прызнае, што ў даследаванні тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў нас ёсць пэўныя праблемы. «Трэба пагадзіцца і з тым, што першай ахвярай на вайне становіцца праўда, — мяркуе Андрэй Максімчык. — Яна, магчыма, нам яшчэ не да канца вядомая. Мы знаходзімся ў цісках савецкай парадыгмы, таго падыходу да інтэрпрэтацыі падзей Вялікай Айчыннай вайны. І калі з'яўляюцца працы, якія вельмі рэзка выбіваюцца з гэтага кантэксту, на іх чамусьці адразу накідваюцца і гавораць аб тым, што гэта чарговы прадукт фальсіфікацыі. Насамрэч жа, калі паглядзець на той матэрыял, які быў выкарыстаны, даследаванні падрыхтаваныя на такой жа архіўнай базе, з якой працавалі нашы папярэднікі. У савецкі перыяд многае адфільтроўвалася, асабліва гэта датычылася падпольнага і партызанскага руху».

— Адыходзяць сведкі вайны, і мы на іншым эмацыянальным узроўні ўспрымаем тыя падзеі, — канстатуе кандыдат гістарычных навук. — Праз некалькі гадоў Вялікая Айчынная вайна для нас будзе нечым далёкім. Гэта заканамерна і аб'ектыўна. Таму нам, у першую чаргу гісторыкам, патрэбна максімальна сканцэнтравацца на выяўленні новых фактаў, публікацый дакументаў, рабоце, звязанай з гістарычнай памяццю. Нам трэба звярнуць увагу на помнікі, якія маюць патрэбу ў рэстаўрацыі, паднясь тыя падзеі, якія потым могуць стаць асновай для мемарыялізацыі і стварэння новых аб'ектаў, якія патрэбныя нашай краіне».

Будзьце пільныя!

# СУПРАЦЬ ВОГНЕННАЙ СТЫХІІ

## Колькасць лясных пажараў скарацілася

**Беларускія ратавальнікі змагаюцца з пажарамі ў Петрыкаўскім раёне, што на Гомельшчыне, — там гараць тарфянікі. Плошча ўзгарання зменшылася і ўжо складае 40 гектараў, аднак работа па ліквідацыі ачагоў працягваецца.**

У тушэнні пажару задзейнічаны 22 адзінкі тэхнікі і каля ста чалавек, сярод якіх — супрацоўнікі МНС, прадстаўнікі мясцовага прадпрыемства меліярацыйных сістэм і сельскагаспадарчых арганізацый. Ускладняюць тушэнне глыбіня залягання торфу, недастатковы ўзровень вады ў сістэме меліярацыйных каналаў, а таксама гарачыня апошніх тыдняў. Днямі крыху пахаладала, узмацніўся вецер — узнікла неабходнасць у перадыслакацыі сіл і сродкаў з улікам абстаноўкі, якая складваецца.

Як паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі, пажаранебяспечная абстаноўка ў лясным фондзе нашай краіны стабілізавалася. Толькі ў асобных раёнах Беларусі захоўваецца чацвёрты клас пажарнай небяспекі. У большасці ж рэгіёнаў ужо знятыя забароны і абмежаванні на наведванне лясоў. Па стане на ўчарашнюю раніцу, меры абмежавальнага характару дзейнічаюць усяго ў 11 раёнах краіны.

— З пачатку года ў лясным фондзе Мінлясгаса адбылося 316 узгаранняў, — адзначаюць у прэс-службе. — Агульная плошча ачагоў склала звыш 370 гектараў. Найбольшая колькасць узгаранняў фіксуецца ў паўднёвай частцы краіны: у Брэсцкай і Гомельскай абласцях. З пачатку года тут адбылося 90 і 87 лясных пажараў адпаведна. За аналагічны перыяд на Віцебшчыне было зафіксавана 19 выпадкаў узгарання, на Гродзеншчыне — 32, Міншчыне — 43, Магілёўшчыне — 45 узгаранняў.

Асноўнай прычынай узнікнення пажараў па-ранейшаму з'яўляецца неасцярожнае абыходжанне з агнём, выпальванне сухой травы, прыродныя з'явы. Міністэрства лясной гаспадаркі заклікае грамадзян з разуменнем аднесціся да існуючых забарон і абмежаванняў на наведванне лясоў, а таксама не парушаць правілы пажарнай бяспекі.

**Вераніка КАНЮТА.**



Супрацоўнікі МНС падчас ліквідацыі пажару ў Петрыкаўскім раёне.